крыжык з выявай распяцця на адным баку (мяркуючы па прыліплай да яго вушы пацеркі, і абрыўку, які злучае ніткі, гэты крыжык насіўся ў складзе караляў)» [2, с. 415].

У вёсцы Курганне таксама быў знойдзены нацельны крыжык, які сведчыць, што нашы продкі радзімічы, якія пражывалі на тэрыторыі Жлобіншчыны, хавалі сваіх продкаў па-хрысціянску яшчэ да шырокага распаўсюджання праваслаўя.

Такім чынам, пачатак распаўсюджвання Слова Божага на беларускіх землях, які звязаны з апосталам Андрэем (легенда гэта ці праўда дакладна не высветлена да нашага часу), прыходзіўся на ранейшы за афіцыйны час Хрышчэння Русі.

**Бібліяграфічны спіс:**


1. Аповесць мінулых гадоў [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://azbyka.ru/otechnik/Nestor_Letopisets/povest-vremennyh-let/. – Дата доступу: 10.04.2023.
2. Археологические открытия 1975 года : сб. статей / АН СССР, Ин. археологии ; отв. ред. Б. А. Рыбаков. – М. : Наука, 1976 г. – 604 с.
3. Новосельцев, А. П. Древнерусское государство и его международное значение / П. Новосельцев [и др.]. – М. : Наука, 1965 г. – 476 с.
4. Прошин, Г. Как была крещена Русь / Г. Прошин [и др.]. – М. : Полит. издат, 1989 г. – 320 с.


## АДМЕТНАСЦЬ ЖАНОЧАГА ВОБРАЗА Ў ТВОРЧАСЦІ У. КАРАТКЕВІЧА


***У. А. Ралько***

*УА «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка», г. Мінск*

*Навуковы кіраўнік – Т. М. Тарасава, доктар філалагічных навук, прафесар*



**Анатацыя.** У артыкуле вылучаюцца характэрныя рысы жаночага вобраза ў творчасці Уладзіміра Караткевіча. Акрэсліваецца, якім чынам жаночыя вобразы, неабавязкова галоўныя, уплываюць на разгортванне рамантычнага сюжэта, падкрэсліваецца адметнае. Адлюстроўваецца значэнне караткевічаўскага вобраза жанчыны ў беларускай літаратуры.



**Ключавыя словы:** У. Караткевіч; вобраз жанчыны; адметнасць.

Вобраз жанчыны ў беларускай літаратуры ёмісты і разнастайны, бо кожны аўтар стварае пэўны жаночы ідэал. Дарэвалюцыйная беларуская проза прадстаўляла жанчыну найперш у розных іпастасях: гаротнай маці, добрай альбо дрэннай нявесткі і жонкі, сіраты, гараджанкі ці сялянкі-бяднячкі, каханай дзяўчыны. Як у жыцці, так і ў літаратуры жанчына адыгрывала пераважна пасіўную ролю, выступаючы перадусім як аб’ект, а не як суб’ект гісторыі.

Сучасная літаратура мае тэндэнцыю, з аднаго боку, да высокага філасофскага асэнсавання вобраза жанчыны, а з другога – да вяртання жанчыне яе спрадвечнага месца ва ўтульным хатнім свеце.

Творы многіх беларускіх аўтараў, асабліва пісьменнікаў мужчын, маюць выразную андрацэнтрычную арыенціроўку. Не стаў выключэннем і Уладзімір Караткевіч, вядучымі персанажамі якога таксама з’яўляюцца мужчыны [1, с.152]. Тым не менш, якасць распрацоўкі і эмацыянальнасць раскрыцця пісьменнікам жаночых вобразаў, безумоўна, заслугоўвае ўвагі. У. Караткевіч – рамантык, таму разглядаць яго творчасць без уплыву на яе жанчын мы не можам.

Зыходзячы з гэтага, звернемся да гістарычных аповесцей «Сівая легенда», «Цыганскі кароль», «Ладдзя Роспачы», «Дзікае паляванне караля Стаха»; аповесцей «У снягах драмае вясна», «Лісце каштанаў», рамана «Леаніды не вернуцца да Зямлі» («Нельга забыць»). Зробім спробу высветліць, якім чынам жаночыя вобразы, неабавязкова галоўныя, уплываюць на разгортванне рамантычнага сюжэта.

У экспазіцыі да твора аўтар дае зразумець, ад чыйго імя ён будзе апісваць тую ці іншую гераіню. Атрымліваем, што выключна ад імя мужчын: у аповесці «Сівая легенда» апавядальнікам з’яўляецца скептычна настроены немец Канрад Цхакен, у аповесцях «Цыганскі кароль», «Ладдзя Роспачы», «Дзікае паляванне караля Стаха» – галоўны герой.

На этапе завязкі становіцца відавочным, што асноўны, сацыяльна абумоўлены канфлікт твора ўскладняецца духоўным, маральным канфліктам. Так, не здолеўшы пераканаць пана Аляхно Кізгайлу (аповесць «Сівая легенда»), Раман Ракута вымушаны сілаю ратаваць з няволі сваю каханую – прыгонную Ірыну, уступаючы на чале мужыцкага войска ў няроўны бой з наёмнікамі Канрада Цхакена. Народны бунт у аповесці «Цыганскі кароль» успыхвае з-за прылюднай абразы каралём Якубам цяжарнай Алёны Свеціловіч, а потым зняважкі «каронным суддзёй» яе сястры Аглаі. Юная прыгажуня Бярозка (аповесць «Ладдзя Роспачы») таксама сваім нечаканым з’яўленнем выклікае маральны канфлікт у душы «хобаля, залётніка, піякі, задзіры» Гервасія Выліваха [1, с.152]. Несправядлівы і жорсткі лёс Надзеі Яноўскай (аповесць «Дзікае паляванне караля Стаха») вымагае ад Андрэя Беларэцкага змагання з кланам выміраючай беларускай шляхты.

Далейшыя падзеі пры разгортванні сюжэта ў многіх праяўленнях нагадваюць здзяйсненне подзвігаў «дзеля дамы сэрца» ў рыцарскім рамане. Сапраўды, чыстыя і наіўныя семнаццаці-васемнаццацігадовыя гераіні вызначаюцца тонкаю, рэдкаю знешняй прывабнасцю, якая натхняе шляхціцаў на гераічныя ўчынкі. Вось як пісьменнік апісвае Ірыну: «...бровы зламаныя, вочы вялікія, шэрыя, ...рот велікаваты, і нос не зусім роўны. Няправільнае аблічча, і ўсё адно – такіх не забываюць». У Аглаі Свеціловічавай незвычайныя вочы – то «белыя ад ярасці» [1, с.153], то ў іх «стаіць сапраўдны жах» [1, с.153], а то можна «пабачыць адбіткі зор» [1, с.153]. Сялянка Бярозка ўяўляецца Гервасію «прыгажэйшаю, маладзейшаю, лепшаю» [1, с.153]. У Надзеі Яноўскай – «духмяныя доўгія валасы» [1, с.153], а «вочы прамяністыя і ціхія» [1, с.153], «глыбокія, як вір» [1, с.153]. На святкаванні дня свайго паўналецця яна для Беларэцкага – «мара, лясны дух, казачная здань», «каралеўна-лебедзь, уладарка бурштынавага палаца» [1, с.153].

Нельга не захапляцца такімі жанчынамі, асабліва калі ты – малады і закаханы персанаж Караткевічавага твора. Пісьменнік тым не менш адмаўляеца ад выключна знешняга ацэначнага погляду мужчыны на прадстаўніц слабога полу. Дар'я, дачка вартаўніка брамы з аповесці «Сівая легенда», удзельнічае ў абароне замка Кізгайлы поплеч з узброенымі воінамі. Яму ж, ганарыстаму нобілю, кідае свае гнеўныя, поўныя патрыятызму словы закутая ў кайданы прыгонная Ірына: «Запраданец. Юда. Веру прадаў, братоў прадаў. Хай згіне твой род» [1, с.153]. Дзяўчына ў фінале твора абірае вечную слепату замест здрады сумленню. Ці не гэта мы называем мужнасцю? «Сціплы, але цвёрды гонар, якога яму (Міхалу Яноўскаму) яшчэ не даводзілася бачыць» [1, с.153], трапятаў і ў вачах «халопкі» Аглаі. «Прамаці Ева. ...Яна зразумела, відаць, што заснуў на яе каленях адзін – і ён быў слабы і бездапаможны, – а прачнуўся зусім другі – у ім моц моцных» [1, с.153], – піша аўтар, падкрэсліваючы гарманічную, «лекавую» сілу дзявочага, жаночага пачуцця. Падтрымлівае ў Андрэю Беларэцкім агеньчык змагання, здаецца, з непераможнымі абставінамі і Надзея Яноўская – «танюткі сітняг, без якога ён, моцны, адразу зламаецца» [1, с.153], бо галоўны герой «зразумеў, што нейкім дзівам з яе атрымаўся сапраўдны чалавек» і што «гэтаму чалавеку трэба абавязкова дапамагчы» [1, с.153]. Нягледзячы на смяротную небяспеку, дзяўчына двойчы выратоўвае Андрэя ад дзікага палявання, падаючы прыклад адданасці і вернасці сваім перакананням. Зноў-такі, у спрэчцы з Кастлявай Бярозка гатова ахвяраваць дваццаццю гадамі ўласнага жыцця, каб не здрадзіць падараванаму ёй лёсам каханню.

З узвышаным, чыстым каханнем цнатлівай дзяўчыны Уладзімір Караткевіч неадрыўна звязвае ў свядомасці сваіх персанажаў адчуванне Радзімы, свайго народа. І Алёна, і Аглая, і Дар'я, і Ірына, і Бярозка – сялянкі, пані Надзея таксама адмаўляецца ад фамільнага маярату і цяжкай спадчыны крывавых продкаў. Беларуская зямля і беларуская жанчына ўзгадваюцца побач і ў эпізодзе з кветкай

шыпшыны – увасабленнем роднай зямлі, якую Гервасій дорыць у час небяспекі Бярозцы. Вучыць нанава жыць «з людзьмі», а не па-панску раздаўленага ганьбаю Міхала Яноўскага Аглая. Годны нобіль Раман Ракута змагаецца не проста за каханую, а за каханую-сялянку – прадстаўніцу таго народа, што робіць неўміручым беларускі край.

Умее аўтар захапіць чытача не толькі «светлымі», узвышанымі жаночымі вобразамі, а і «цёмнымі» загадкавымі постацямі – такімі як уладная пані Любка («Сівая легенда»), сквапная ахмістрыня Яноўскіх («Дзікае паляванне караля Стаха»), зняверaная Бона Сфорца і сама Смерць («Дзікае паляванне караля Стаха»). Для яго як бы не існуе жанчын добрых і дрэнных, а «ёсць шчаслівыя і не» (Л. Дранько-Майсюк). Пані Любку драпежнаю зрабіла не прыроджаная злосць, а хваравітая рэўнасць да Рамана. Старую ахмістрыню на агідны ўчынак падштурхнула беспрасветная беднасць і неадукаванасць. Бона Сфорца збіраецца жорстка пакараць Вылівaху, бо была сама абдзелена ў каханні і не здольна зразумець яго жыццелюбівай натуры. Нават Смерць ва Уладзіміра Караткевіча – «таксама жанчына, з нянавісцю да шчаслівых і зайздрасцю да іх» [1, с.155], у якой да ўсяго яшчэ нялёгкая работа. «Больш за ўсё я не люблю прыходзіць да такіх, як ты» [1, с.155], – скардзіцца яна Гервасію.

Цікавы сюжэтны ход уяўляе сабой наяўнасць двух падобных жаночых вобразаў – галоўнага і эпізадычнага, адцягненага ад асноўнага ў часе і прасторы твора. Так, напрыклад, аўтар зазначае, што Надзея Яноўская як бы сышла са старажытнага партрэта сваёй дальняй сваячкі з «дзіўнай, незразумелай усмешкаю, якую так неперaймальна рабілі часам нашы старыя мастакі». І Бярозка для Вылівахі была «вельмі ж падобная на тую жанчыну, за якой ён больш за ўсё ўпадаў. На адзіную, якая не аднеслася паблажліва да яго маленняў». Вельмі нагадваюць адна адну і сёстры Свеціловічавы ў аповесці «Цыганскі кароль»: Алёну, зняважаную, прысаромленую, мы бачым на пачатку твора, Аглаю, моцную духам, годную – у фінале. Гэтыя скразныя вобразы-адлюстраванні, трансфармацыі ўказваюць на повязь і ўзаемаабумоўленасць усіх падзей твора, на перапляценне мінулага і сучаснага, на сувязь зла і непазбежнай расплаты за яго (вобраз жанчыны-забойцы мужа з партрэта і вобраз Надзеі), граху і цнатлівасці (вобразы незамужняй цяжарнай Алёны і Аглаі), здзейсненага і магчымага (вобразы Бярозкі і непрыступнай каханай Гервасія).

Такім чынам, бачым, што рамантычныя аповесці У. Караткевіча «Сівая легенда», «Цыганскі кароль», «Ладдзя Роспачы», «Дзікае паляванне караля Стаха» побач з гістарычным і гераічным матэрыялам напоўнены таксама духоўна-інтымным і філасофскім зместам, які ўплецены ў сюжэтную канву дзякуючы запамінальным, глыбокім, узвышаным вобразам беларускіх жанчын [1, с.156].

Тым не менш жаночыя вобразы Караткевіча ўяўляюць пэўную таямніцу для даследчыкаў. Сярод навукоўцаў існуе меркаванне, што глыбіня раскрыцця іх

характараў і псіхалогіі паводзін значна адрозніваюцца ад мужчынскіх, а калі быць дакладным, то нават саступаюць у сваёй канкрэтнасці і дэталёвасці абмалёўкі характараў [3, с. 153]. Найбольш паказальны прыклад – каханая Юрася Братчыка ў творы «Хрыстос прызямліўся ў Гародні» Анея. Нягледзячы на агульны рамантычны абрыс, калі гераіня аказваецца ў цэнтры закаханасці, жарсцяў, Анея ўвогуле падобная на нейкі прывід, які лётае ў паветры, амаль не дакранаючыся да зямлі. У гэтым жа творы ў вандроўках па вёсках, мястэчках і гарадах Беларусі Братчыка-Хрыста і апосталаў суправаджае Марына Крывіц. Гэта таксама спецыфічнае пераасэнсаванне біблейнага вобраза Марыі, «што названая Магдалінаю, з каторай выйшла сем д’яблаў», якая разам з іншымі, вылечанымі ад ліхіх духаў і хваробаў жанчынамі, суправаджала Хрыста і Яго апосталаў у вандроўках па гарадах і сёлах. Насуперак біблейнаму вобразу блудніцы, што адразу паверыла ў Хрыста і пакаялася, Марына Крывіц спачатку выступае ў ролі шпіёна з варожага лагера. Але потым, калі Яна разгледзела сутнасць Братчыка-Хрыста, палюбіла яго.

Некаторыя даследчыкі прыходзяць да высновы пра тое, што мужчыны пісьменнікі схільныя паказваць жанчын як асоб эмацыянальных, недальнабачных, няздатных да самакантролю ў складаных сітуацыях, у плане інтэлектуальным – нясхільных да рэфлексіі і прыняцця абгрунтаваных рашэнняў.

На прыкладзе аўтабіяграфічнай аповесці «Лісце каштанаў» мы бачым, што гэта не так. Аўтар знаёміць нас з двума жаночымі вобразамі – Нонкай і Лізай. Дадзены твор – гісторыя жыцця падлеткаў падчас Вялікай Айчыннай вайны. Вобразы дзяўчат наскрозь насычаны пачуццямі, але У. Караткевіч здолеў зрабіць эмацыянальны вобраз Лізы больш актыўным удзельнікам са знешнім светам, тады як Нонка пакідае свае пачуцці ў сабе.

У дзеяннях Нонцы можна заўважыць парушэнне логікі. На першы погляд гэта, несумненна, вызывае разгубленасць і ў героя, і ў чытача, але пасля аўтар тлумачыць паводзіны дзяўчыны: «Я зразумеў: адным ударам яна памірыла ворагаў, аднавіла кампанію і сваё месца ў ёй, месца нашай атаманшы і каралевы, уваскрасіла план, якім мы жылі, ды яшчэ адначасна, за адным разам, ашчаслівіла мяне, здаровага боўдзілу, даўгалыгага дурнога дылду. Яно ўмела разлічваць, гэтае дзяўчо, і яно выбрала аптымальны варыянт, пакінуўшы дрэннае толькі адной сабе».

Нягледзячы на атрактыўныя адрозненні вобразаў і іх эмацыянальную афарбоўку Нонка і Ліза аднаchасова з’яўляюцца галоўнымі гераінямі аповесці. Дзве дзяўчыны паўплывалі на сюжэт і галоўных герояў праз самаахвярнасць і пагарду ўласнымі пачуццямі дзеля пачуццяў іншых.

Вядома, што распрацоўцы названых персанажаў У. Караткевіч аддаў шмат часу. Пра тое, што пісьменнік хацеў прадставіць у беларускай літаратуры адметнага героя, які б найбольш поўна раскрываў сутнасць характару беларуса,

сведчылі мастацкія задумкі і разважанні У. Караткевіча. У лістах да М. Танка ён пісаў: «Ну вось, скажам, французы маюць свой літаратурны тып, які з найбольшай паўнатой змалёўвае ўсю нацыю, немцы і іспанцы – таксама … А вось у нас гэтага няма. Назавіце мне тып, які ўсебакова адбіваў бы рысы лепшага нашага чалавека, яго талент, яго характар, яго барацьбу, які, так бы мовіць, нават часткова адбіваў бы гісторыю народа. Яго няма, але ён павінен з'явіцца…» [2, с. 602].

У. Караткевіч змог дасягнуць «свайго літаратурнага тыпу», зрабіўшы яскравыя і запамінальныя вобразы жанчын. Іх духоўнае багацце і хараство, маральная чысціня і беззаганнасць, вернасць перадавым грамадскім і эстэтычным ідэалам прывабліваюць і хвалююць. У. Караткевіч дакладна перадаў тонкія душэўныя перажыванні, выявіў не толькі ідэальнае ў характарах жанчын, але і раскрыў іхняе, такое натуральнае і простае, імкненне да звычайнага людскога шчасця.

Жаночыя вобразы маюць фундаментальнае значэнне не толькі для рамантычнай асобы аўтра, але і для ўсёй беларускай літаратуры, што, безумоўна, сведчыць пра іх маштабнасць.

**Бібліяграфічны спіс:**


1. Воюш, І. Д. Жаночыя вобразы і іх мастацкая функцыя (на матэрыяле твораў У. Караткевіча) / І. Д. Воюш // Рэспубліканскія Купалаўскія чытанні : матэрыялы навук. канф., Гродна, 24 кастр. 2001 г. / Гродзен. дзярж. ун-т ; рэдкал.: У. І. Каяла (адк. рэд.) [і інш.]. – Гродна, 2002. – С. 152–156.

2. Караткевіч, У. Лісты / У. Караткевіч // У. Караткевіч. Выбраныя творы: ук- лад., прадм., камент. А. Вераб'я. – Мінск : Бел. кнігазбор, 2005. – С. 587–648.

3. Марціновіч, Д. Паляванне на Алёнку: роздум пра жаночыя вобразы ў творах Уладзіміра Караткевіча / Д. Марціновіч // Маладосць. – 2004. – № 9. – С. 148–153.


## ЛЮБОЎНЫ ТРОХКУТНІК У АПОВЕСЦІ У. КАРАТКЕВІЧА «ДЗІКАЕ ПАЛЯВАННЕ КАРАЛЯ СТАХА»


***К. В. Раўдзіс***

*УА «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка», г. Мінск*

*Навуковы кіраўнік – Н. В. Заяц, кандыдат філалагічных навук, дацэнт*